Весткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

Viestki j Paviedamleńni

Сусьветнае сеціва: *e-krama.com, pahonia.com*
Электронны адрас: *viestki@mail.com*
✉ *P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735*

№ 9 (631)
Верасень 2018 г.

Мітынг у падтрымку журналістаў і прафсаюзаў

У суботу, 11-га жніўня, на Юніан-Сквэр у Нью-Ёрку прайшоў мітынг салідарнасьці з журналістамі і прафсаюзамі ў Беларусі, якія трапілі пад перасьлед і арышты ў выніку недаказаных абсурдных абвінавачаньняў. На гэтым тыдні пад прэтэкстам нібыта несанкцыянаванага доступу да зьместу інфармацыяў дзяржаўнай навінавай агенцыі БелТА былі арыштаваныя журналісты недзяржаўных мэдыя-парталу Тут-бай, навінавай агенцыі БелаПАН і газэты “Беларусы і Рынак”. Перад тым арыштоўваліся журналісты зь Белсату, некаторых іншых незалежных мэдыяў. Затрымліваліся блёгеры ў Горадні й Берасьці. Працяглы час блякаваўся сайт Хартыі-97.

Днямі таксама распачаўся суд над прадстаўнікамі незалежнага прафсаюзу РЭП, сакратарка якога аказалася ўцягнутай у супрацоўніцтва са спэцслужбамі. На суд над кіраўніком прафсаюзу РЭП Генадзем Фядынічам і галоўным бугальтарам Ігарам Комлікам прыйшлі больш за 70 чалавек, якія выказвалі сваю падтрымку прафсаюзным дзеячам.

Дзеля гэтага Згуртаваньне “Пагоня” падрыхтавала мітынг на Юніан-Сквэр у Нью-Ёрку, дзе ад другой паловы 19-га стагодзьдзя праходзілі традыцыйныя мітынгі прафсаюзаў, анархістаў, антываенных актывістаў, сацыялістаў ды іншых групаў, што спрабавала заявіць пра сябе ды зрабіць свой голас чутным. Беларусы выйшлі выказаць сваю салідарнасьць зь незалежнымі журналістамі й прафсаюзамі, якія зьяўляюцца часткаю грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі, што знаходзяцца стала пад атакаю збоку ўладаў. Журналісты – дзеля аб’ектыўнага інфармаваньня аб падзеях у краіне, а незалежныя прафсаюзы – дзеля сапраўднага, а не папяровага, дбаньня пра дабрабыт працаўнікоў, у адрозьненьні ад дзяржаўных прафсаюзаў, што фактычна зьяўляюцца філіяй дзяржаўнай бюракратыі.

Напачатку мітынгу, што прайшоў каля коннай статуі бацькі-заснавальніка Злучаных Штатаў Джорджа Вашынгтона, удзельнікі зь бел-чырвона-белымі сьцягамі сталі паўкругам, трымаючы плякаты з надпісамі, у якіх падтрымлівалася дзейнасьць журналістаў і прафсаюзаў. Перад прысутнымі выступіў старшыня Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня” сп. Віталь Зайка, ён распавёў пра апошнія падзеі ў Беларусі,ператрусы і арышты ў рэдакцыях незалежных мэдыяў, перасьлед прафсаюзу РЭП. Прамоўца адзначыў, што, нягледзячы на тое, што большасьць журналістаў ужо выпусьцілі на волю пасьля затрыманьня, сытуацыя са свабодаю слова і свабодаю друку ў краіне застаецца неспрыяльнай, сваволя сілавых структураў можа ў любы момант выліцца ў новыя рэпрэсіі й арышты, і менавіта таму так важна ця-

заканчэньне на бачыне 2



Жнівеньскі сход-пікнік Згуртаваньня “Пагоня”

У нядзелю, 12-га жніўня, у Праспэкт-Парку ў Брукліне адбылася таварыская імпрэза, спалучаная са сходам Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”, якая ладзілася супольна з групаю “Беларусы ў ЗША. Разам лягчэй”.

У гэты прыемны сонечны дзень, падчас імпрэзы, у якой узяло ўдзел каля 80 чалавек, прысутныя маглі скаштаваць барбэкю і шашлыка, узяць удзел у гульнях і забавах, але самае галоўнае – знаёміцца і наладжваць міжасабовыя кантакты зь землякамі зь Беларусі. Нават прайшоўшы дождж не перашкодзіў прыемна бавіць час, дапамаглі пастаўленыя над сталамі намёты-навесы.

Прысутныя вельмі пазытыўна адгукаліся пра хаду імпрэзы. Выказвалі пажаданьні, каб такіх таварыскіх мерапрыемстваў было як найболей. Асобная падзяка за арганізацыю пікніка належыцца Ганьне Шарко, Аляксандру Мазгавому, Яўгеніі Васілеўскай, Анатолю Цяценькіну.

Віталь ЗАЙКА



Мітынг у падтрымку журналістаў і прафсаюзаў

заканчэньне з бачыны 1

пер падтрымаць незалежныя мэдыі й прафсаюзы Беларусі.

Затым перад прысутнымі выступіла сп-ня Яўгенія Васілеўская, яна сказала пра неабходнасьць падтрымаць свабоднае слова і дэмакратыю ў Беларусі, а таксама адзначыла, што тут, ва ўмовах свабоды і павагі да правоў чалавека, мы маем мажлівасьць выказаць сваю салідарнасьць з тымі, хто дзейнічае ва ўмовах несвабоды, і заявіць пратэст супраць перасьледу і рэпрэсіяў. “Ня трэба баяцца і саромецца. Тут, у ЗША, мы маем усе ўмовы для нармальнага самастойнага жыцьця, дык ня будзем забывацца на тых, каму патрэбная нашая дапамога”.

Затым удзельнікі акцыі хадзілі па пляцы перад помнікам Вашынгтону, выгукаючы лёзунгі і заяўляючы ў мэгафон для прысутнай амэрыканскай публікі аб мэтах акцыі. Напрыканцы прагучэлі гімны “Магутны Божа”, “Мы выйдзем шчыльнымі радамі” і песьня “Грай! Шукай!” Імпрэза таксама стала нагодаю для знаёмстваў, наладжваньня стасункаў і калегаваньня сярод землякоў.

Віталь ЗАЙКА



Курапаты

Курапаты каля Менску — гэта найвялікшы магільнік беларускіх ахвяраў, забітых расейскімі акупантамі ў пэрыяд камуністычнага генацыду нашай нацыі (1937-1941). Нацыянальны Мэмарыял, створаны на гэтым месцы беларускім народам, мае афіцыйны статус аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны Першай катэгорыі.

Афіцэры савецкай сакрэтнай паліцыі НКВД расстралялі ў Курапатах і закапалі ў ямах каля 250 000 чалавек з 1937 г. па 23 чэрвеня 1941 г. (другі дзень нямецкай інвазіі супраць Савецкага Саюзу). Па загаду Масквы расейскія камуністычныя акупанты забівалі нявінных людзей — мужчын і жанчын — тут і ў многіх іншых месцах па ўсёй Беларусі. Масква спускала адміністрацыі кожнай вобласьці, раёну і вёскі мясцовы плян зьнішчэньня беларускага насельніцтва. Штоноч спэцыяльныя закрытыя машыны НКВД (“хапуны”) прыяжджалі ў мясцовасьці і арыштоўвалі ахвяраў. Арыштаваных збольшага прыгаворвалі да сьмерці на аснове незаконных прысудаў так званых “троек” (тры прадстаўнікі савецкай адміністрацыі, НКВД і камуністычнай партыі).

Расейскія камуністычныя акупанты забівалі перш за ўсё беларускіх пісьменнікаў, паэтаў, навукоўцаў, гаспадарнікаў, прафэсуру, а таксама многіх рабочых і сялян, сьвятароў і вернікаў. НКВД забіў усіх да аднаго беларускіх археолягаў і мастацтвазнаўцаў. З 800 пісьменнікаў і паэтаў забілі 633 асобы. Са 104 асобаў вышэйшай кіруючай адміністрацыі дзяржаўнай ўлады забілі 102 асобы. За савецкі пэрыяд з 1917 году расейскі НКВД зьнішчыў каля двух мільёнаў чалавек у Беларусі (20% насельніцтва).

Савецкая адміністрацыя трымала ў сакрэце месца расстрэлаў цягам многіх гадоў. У 1988 г. гэтае месца было адкрыта і дасьледвана сп. Зянонам Пазьняком, вядомым археолягам (потым і цяпер палітычны дзяяч апазыцыйнага накірунку). Археолягі знайшлі на сёньняшні дзень каля 600 ямаў з парэшткамі ахвяраў у Курапатах. У 1988 г. Пракуратура Беларусі ўзбудзіла крымінальную справу і назірала (разам зь Беларускім Міністэрствам Унутраных Спраў і Беларускай Акадэміяй навук) за археалягічнымі раскопкамі і эксгумацыямі ў Курапатах.

У 1990 г. камуністычныя ўлады Беларусі вымушаныя былі прызнаць факт масавых забойстваў людзей савецкім НКВД у Курапатах. Масаваму магільніку была нададзеная афіцыйная ахова.

Але пуцінская Масква і яе сатэлітны рэжым Лукашэнкі некалькі разоў (пад ціскам Масквы) спрабавалі зьнішчыць Курапаты. Беларускі народ бараніў сваю сьвятыню, змагаючыся супраць аддзелаў міліцыі і КГБ. Апошнім часам Масква зноў цісьне на дыктатарскі рэжым Лукашэнкі і зноў імкнецца разбурыць Народны Мэмарыял. Для пуцінскай Расеі гэта важна, бо парэшткі расстраляных людзей у Курапатах ёсьць факталягічнай улікай злачынства генацыду. Масква імкнецца пазьбегнуць адказнасьці за масавыя забойствы людзей.

Курапаты маюць спэцыяльную ахоўную зону. Менавіта ў гэтай зоне ўлады дазволілі пабудову рэстарана і забаўляльнай установы на загад Масквы і ў выніку карупцыі. Гэта ёсьць грубым парушэньнем Закону. Рэстаран “Поедем-поедим” мае банкетныя залі, танцавальныя холы, саўну, а таксама інтымныя пакоі. Сп. Леанід Зайдэс зьяўляецца адказным уладальнікам гэтага комплексу. Каля 30 расейскіх і замежных фірмаў удзельнічаюць у гэтым незаконным праекце.

Спачатку Пракуратура і Міністэрства культуры Беларусі прынялі прапанову выканаць закон і ліквідаваць гэты незаконны аб'ект. Але пачалі дзейнічаць карупцыя і палітычныя схемы. Нягледзячы на пратэсты грамадзтва супраць парушэньня Закону, рэстаран і забаўляльная ўстанова былі адкрытыя для кліентаў.

Сэнс гэтай правакацыі — праз кашчунства, празь зьнявагу пачуцьцяў людзей і сакральнага зьместу нацыянальнага магільніка памяці пра генацыд — выклікаць грамадзкія канфлікты і скарыстаць іх як повад для зьнішчэньня Народнага Мэмарыялу, стварыць там мэмарыяльную фальшыўку, заблытаць і зацямніць праўду пра злачынствы супраць чалавецтва.

Беларускае грамадзтва пратэстуе, заклікае да шанаваньня маралі, патрабуе ліквідацыі блюзьнерскага аб'екту, разьмешчанага ў ахоўнай зоне Народнага Мэмарыялу генацыда. Грамадзкія прадстаўнікі і актывісты заклікаюць ўсіх сумленных людзей байкатаваць гэты ганебны забаўляльны рэстаран, не падтрымліваць ягонае існаваньне.

Зянон ПАЗЬНЯК

Рэпліка аб расейскай гібрыднай вайне

Гібрыдная акупацыя Беларусі знутры — гэта тая форма вайны, якая прывяла да ўлады Лукашэнку. Пра гэта намі гаворыцца з 1994-га году. Але адсутнасьць нацыянальных беларускіх СМІ, захоп іх расейскай агентурай не далі магчымасьці прабіцца гэтым ведам нават ў палітычныя вяршыні грамадзтва, хоць пісалася мноства артыкулаў аб унутраннай акупацыі Беларусі, друкаваліся кнігі. Веды ў шырокае разуменьне так і не прабіліся.

Маскоўская агрэсія супраць Украіны, захоп Крыму і Данбасу, аднак, паспрыялі адэкватным поглядам на рэчаіснасьць і ў часткі беларускага грамадзтва. Украінцы і шмат якія беларусы ўбачылі, якім разбуральным спрутам зьяўляецца Расея на целе чалавецтва. Вечнае бядотнае існаваньне расейскіх людзей і рабская псыхалёгія, калі яна становіцца агрэсіўнай ідэалёгіяй, робіцца небясьпечнаю разбуральнаю сілаю. Сацыяльны і палітычны вопыт камунізму (ідэалёгіі нізоў) быў катастрафічны для чалавецтва.

Пасьля ўпадку ідэалёгіі камунізму зьявілася імпэрская ідэалёгія “русского мира”. Сваім ворагам гэтая агрэсіўная ідэалёгія лічыць усё чалавецтва.

Палітыка “русского мира” была сфармуляваная ў агульных рысых у жніўні 1995 году ў так званай дактрыне Ельцына аб зьнешняй палітыцы Расеі. Тады быў прыняты дакумэнт аб стратэгічным курсе Расейскай Фэдэрацыі, дзе былі адлюстраваныя ўсе асноўныя элемэнты гібрыднай палітыкі супраць суседніх дзяржаваў. 14 верасьня 1995 г. “курс” быў зацьверджаны ўказам Ельцына. Да слова, шпіёнска-дывэрсійнай мэтодыкай захопу Расея карыстаецца здаўна, найбольш характэрна — з XVIII-га стагодзьдзя (падзелы Рэчы Паспалітай). З прыходам да ўлады КГБ палітыка “русского мира” імкліва набірае агрэсіўныя формы расейскай гібрыднай вайны.

Трэба мець на ўвазе, што ў заходнім сьвеце няма дзяржавы і няма моцы, якая магла б на ўзроўні супрацьстаяць расейскай сіле і тактыцы вядзеньня гібрыднай вайны. Таталітарная арганізацыя расейскай дзяржавы дае магчымасьць ўсе галіны ўлады і грамадзтва (прэсу, друк, радыё, тэлебачаньне, спорт, бізнэс, суды, пракуратуру, крымінал, выканаўчую і заканадаўчую ўлады, войска, паліцыю, спэцслужбы і г. д.) падпарадкаваць адзінай дзяржаўнай палітыцы, выканаўчай і арганізуючай сілай якой зьяўляюцца спэцслужбы (найперш ГРУ і ФСБ). На дэмакратычным Захадзе такая структура дзяржавы не існуе і ў бліжэйшай будучыні ў прынцыпе ня можа быць. Па сваёй прыродзе заходняя сыстэма дзяржавы ня ў стане нават арганізаваць палітыку інфармацыйнай вайны (тым больш кшталту расейскай). СМІ там выконваюць прынцыпова іншыя функцыі, чым ў Расеі (і ў колішнім СССР).

Падрыхтоўка Расеі да захопніцкай вайны — гэта перш за ўсё пагроза Беларусі. Патрэбна дэталёвае вывучэньне становішча і мабілізацыя людзей на гатовасьць да адбіцьця расейскай агрэсіі супраць Беларусі, якая рыхтуецца бесьперапынна.

Зянон ПАЗЬНЯК

“Галгатня пра ЗыШыА”

Соевы фетыш



Тое што вэгетарыянства зь нелюбові да мяса сталася амаль рэлігійным культам, гэта ўжо ўсе даўно заўважылі. Дарэчы, адзін дасьледчык прыкмеціў, што ў большасьці небясьпечных сэктаў вэгетарыянства абавязковае як адна з асноўных дактрынаў. Сакрэт хаваецца ў тым, што людзі, пазбаўленыя амінакіслотаў асноўнаю крыніцаю якіх ёсьць мяса, рабяцца запаволенымі і, мякка кажучы, тугадумнымі. Іншымі словамі, чалавек які ня есьць мяса і не пасьпявае адпаведна кампэнсаваць неабходныя рэчывы іншымі дарагімі прадуктамі, ня вельмі кемлівы і абдурыць яго нашмат прасьцей. Паўстае такі ідэальны для кіраваньня грамадзянін сьвету.

Але байка не пра вэгетарыянства, а пра іншую модную дыету – сою, зь сям'і бабовых, якая быццам бы шмат у чым замяняе мяса і малочныя прадукты. Праблема ў тым, што соя ўтрымлівае ў сабе вялікую колькасьць фітаэстрагенаў, якія маюць падобнае дзеяньне да жаночага эстрагену, што ўплывае на зьмяншэньне колькасьці тэстастэрону. Новае дасьледваньне на Гарвардзе паказвае, што ўжываньне соі зьмяншае якасьць спэрмы. Мужчыны, якія празьмерна ўжываюць сою, становяцца жаноцкімі, голас павышаецца, геніталіі зьмяншаюцца, растуць грудзі (гінекамастыя – больш вядомыя як “bitch tits”), выпадаюць валасы. Мужчына на соевай дыеце пераўтвараецца ў жанчыну, становіцца больш эмацыйным, але таксама больш схільным да дэпрэсіі, бо нізкі тэстастэрон часткова адказвае за дрэнны настрой. Адбываецца такое сымбалічна-ідэалягічнае пераўтварэньне самца ў фэміністку.

У 1992 годзе соевых прадуктаў прадавалася на 300 мільёнаў даляраў, цяпер прадаецца на суму 4 мільярды даляраў. Гэта, як заўважае Пол Джозэф Ўотсан (дарэчы вельмі раю паглядзець блёг гэтага брытанскага камэнтатара), непасрэдна карэлюе са зьніжэньнем тэстастэрону ў мужчын за апошнія дваццаць гадоў. Пол Джозэф Ўотсан зрабіў добрую справу і пазьбіраў выказваньні прыхільнікаў соевай дыеты і ў якасьці шматкроп'я дазволю тут працытаваць адно зь іх: “Starbucks charges extra to sub soy milk in lattes & I think we should petition that this is racist.”

Віталь ВОРАНАЎ

Уплаты ў Згуртаваньне Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíüí³:

А. Адамчык...............60
А. Ідзельчык 60
С. Касалапаў 60
Д. Кісель 60
А. Мазуркевіч 60
І. Пядухоў 60
М. Станішэўская 60
А. Сярко 60

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў Згуртаваньне “Пагоня” шліце на адрас:
P. O. Box 572
New York, NY 10113
Чэкі, калі ласка, выпісвайце на імя скарбніка “Пагоні”
Viktar Yedzinovich.

*Паважаныя **А. Волкава і А. Сьвістун** калі ласка, паведаміце рэдакцыі вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

будзе спалучаны зь сяброўскім пікнікам, які пройдзе **8-га верасьня 2018 году** і ладзіцца супольна Згуртаваньнем *“Пагоня”* і камандай *“Беларусы ў ЗША. Разам лягчэй”* у **Цэнтральным парку** на Мангэтане.

Пікнік пачнецца **а 1-й гадзіне папапаўдні** на Sheep Meadow (*вялікая паляна ў паўноча-заходнім куце парку пры **W. 67th Street** і **West Drive***)

Будуць спартовыя гульні, жывая музыка. Ежу і напоі прыносьце, калі ласка, свае.

З пытаньнямі тэлефануйце **Ганьне Шарко** па нумару тэлефона ***(732) 604-1171.***

Шаноўныя сябры!** Калі ласка, сваечасова абнаўляйце падпіску на “Весткі й Паведамленьні”.* ***(стан падпіскі глядзіце на канвэрце справа ад прозьвішча).

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

А. Адамчык...............30
А. Ідзельчык 30
В. Камоска 30
С. Касалапаў 30
Д. Кісель 30
А. Мазуркевіч 30
М. Станішэўская 30
А. Сярко 30
Д. Тарсумбаеў 30

Шчыры дзякуй!

*Падпісацца на бюлетэнь можна дaслаўшы ў рэдакцыю аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*
Marat Klakotski
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735
*Чэкі выпісвайце на імя скарбніка “Пагоні” **Viktar Yedzinovich**.*

Рэдакцыя бясплатна надрукуе прыватныя абвесткі і будзе ўдзячная за дасланыя для друку артыкулы, водгукі й лісты.